# ТАНКІ ІШЛІ НА ПРАРЫЎ

Наступіў сакавік 1943 года. Менавіта ў гэты час няўдала склалася аператыўная абстаноўка ў раёне Харкава: пад націскам пераўзыходзячых сіл ворага нашы часці вымушаны былі адыходзіць. Камандзір 179 асобнай танкавай брыгады палкоўнік Рудкін атрымаў загад заняць на заходняй ваколіцы сяла Таранаўка рубеж абароны і ўтрымліваць яго разам з 78 стралковым палком палкоўніка Білюціна з 25-й гвардзейскай дывізіі.

Загад камандавання быў кароткім: не дапусціць прарыва танкаў і пяхоты фашыстаў у напрамку на Мярэфу. Таранаўка невыпадкова стала рубяжом абароны нашых войск. Толькі тут, дзе зыходзіліся чыгуначныя і шашэйныя дарогі, можна было затрымаць ворага, не даць яму акружыць часці 3-й танкавай арміі, якая абараняла Харкаў з поўдня.

Танкісты палкоўніка Філіпа Мікітавіча Рудкіна, ураджэнца Мсціслаўскага раёна, занялі абарону ў цэнтры Таранаўкі, акапаліся, падрыхтаваліся да адбіцця варожых атак. Увечары трэцяга сакавіка камандзір брыгады выклікаў да сябе ў штаб вопытнага разведчыка К. В. Кальцова. Ён загадаў разведчыкам прабрацца ў размяшчэнне ворага, выявіць яго агнявую сістэму, а затым паладзіць немцам "канцэрт".

Ноччу разведчыкі брыгады прабраліся ў стан фашыстаў, выявілі яго сілы, а затым зрабілі налёт на адзін з апорных пунктаў. Каля 20 салдат было знішчана ў тым налёце. Не далічыліся фашысты і аднаго танка. Яго знішчыў з нямецкай супрацьтанкавай гарматы старшы сержант Кальцоў, а самую гармату падарваў.

Раніцой немцы перайшлі ў наступленне. У атаку былі кінуты буйныя сілы пяхоты пры падтрымцы танкаў. Ворага сустрэлі танкісты Рудкіна і пяхота палкоўніка Білюціна. Не прарваўшыся праз шчыльны агонь, фашысты адступілі. Так паўтаралася некалькі разоў. З кожнай контратакай ворага бой прымаў усё больш жорсткі характар. Не лічачыся са стратамі, фашысты кідалі супраць абаронцаў Таранаўкі буйныя сілы. Але пераадолець рубеж ім не ўдавалася.

На наступны дзень усё пачалося спачатку. Аднак цяпер гітлераўцам удалося ўклініцца ў абарончы рубеж нашых войск. Каб выправіць становішча, палкоўнік Рудкін кінуў у бой 24 танкі брыгады. Наступленне танкістаў падтрымлівалі воіны 78 гвардзейскага стралковага палка.

Атака была паспяховай – немцы не вытрымалі ўдара савецкіх воінаў і адступілі. Танкісты Рудкіна сумесна з пехацінцамі палкоўніка Білюціна прарвалі кальцо акружэння вакол другога батальёна і разам рушылі далей. Да зыходу дня шостага сакавіка абарона на заходняй ваколіцы Таранаўкі была поўнасцю ўзноўлена.

Некалькі дзён не спыняліся баі за Таранаўку. За час абароны воіны Рудкіна знішчылі 37 танкаў і самаходных гармат, 60 аўтамашын, 12 бронетранспарцёраў, больш 700 салдат і афіцэраў ворага.

Калі задача была выканана, брыгада атрымала загад камандавання выходзіць з акружэння, прарывацца да сваіх. Рудкін аб'яднаў пад сваё камандаванне падраздзяленні 17 брыгады і 19 стралковай дывізіі.

Пад покрывам ночы гэты атрад на чале з Рудкіным моцна ўдарыў па гітлераўцах, умацаваўшыхся ў бліжэйшым саўгасе імя Фрунзе. Вораг не змог прыйсці ў сябе ад раптоўнасці ўдару і панёс адчувальныя страты. У начным баі савецкія воіны знішчылі больш 600 салдат і афіцэраў, 16 танкаў, 25 матацыклаў, два шасціствольныя мінамёты, дзве самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі, 12 станкавых кулямётаў.

У прарыве атраду палкоўніка Рудкіна спадарожнічала ўдача. Імкліва прасоўваючыся ўперад, збіваючы варожыя заслоны, ён у раёне Старага Солтава ўвайшоў у размяшчэнне асноўных сіл фронту. Камандзір атрада Філіп Мікітавіч Рудкін адразу накіраваўся ў штаб з дакладам.

А дакласці было што, разам з яго брыгадай з акружэння выйшлі 2500 байцоў і камандзіраў 17-й стралковай брыгады і 19 дывізіі з пяццю танкамі Т-34.

Радзіма высока адзначыла ратны подзвіг Рудкіна ў баях пад Таранаўкай і выхад з акружэння. 31 сакавіка 1943 года генерал-маёр Філіп Мікітавіч Рудкін быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

**Танкі ішлі на прарыў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1978. — 9 мая. — С. 3.**